## НАУЧНАЯ ЖИЗНЬ

**С. Я. Новікаў**

# XIII МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «БЕЛАРУСЬ І ГЕРМАНІЯ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ» У МДЛУ

11 красавіка 2014 г. у Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце пры актыўнай дапамозе аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі праведзена XIII міжнародная навуковая канферэнцыя «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць», удзельнікамі якой сталі звыш 50 гісторыкаў, у тым ліку госці з Германіі (Берлін, Бохум, Гамбург, Лейпцыг), Латвіі (Рыга), Расіі (Арэнбург, Волагда, Масква, Санкт-Пецярбург).

Прарэктар універсітэта А. М. Гарлатаў, адкрываючы канферэнцыю, адзначыў, што гэта сустрэча праходзіць у адметны год у гісторыі Беларусі – набліжаюцца 70-я ўгодкі вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў летам 1944 года. Менавіта гэтай юбілейнай даце прысвечана чарговая канферэнцыя, праведзеная ў рамках выканання Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2011–2015 гг. «Гісторыя, культура, грамадства і дзяржава» (навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар А. А. Каваленя). Заданне «Ваенная гісторыя» (навуковы кіраўнік – доктар гістарычных навук, прафесар А. М. Літвін) выконваецца кафедрай гісторыі, сусветнай культуры і турызму МДЛУ (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт С. Я. Новікаў).

У сваім выступленні прарэктар выказаў удзельнікам канферэнцыі пажаданні ўдачы, поспехаў і свае спадзяванні на тое, што ў ходзе сустрэчы гісторыкі зробяць важны крок у напрамку ўзбагачэння айчыннай гістарыяграфіі новымі знаходкамі, цікавымі не толькі для шырокай навуковай грамадскасці, але і для цяперашняга студэнцтва.

На чарговай канферэнцыі былі абазначаны тры праблемныя накірункі: 1) На шляху да Вялікай Перамогі: ад зняцця блакады Ленінграда да вызвалення Беларусі; 2) Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны: новыя дакументальныя знаходкі і гістарыяграфічныя ацэнкі; 3) гісторыя беларуска-нямецкіх узаемадачыненняў: мінулае і сучаснасць. У заключнай частцы сустрэчы адбылася прэзентацыя новых выданняў кафедры.

Канферэнцыя праходзіла ў фармаце пленарных пасяджэнняў. Цягам цэлага дня ішлі плённыя дыскусіі з удзелам як вядомых гісторыкаў, так і пачынаючых даследчыкаў, аспірантаў і саіскальнікаў у сферы даследавання праблем ваенна-гістарычнай навукі. Фактычна кожнае пленарнае пасяджэнне ўяўляла сабой самастойную міні-канферэнцыю, у цэнтры якой знаходзілася пэўная вузлавая праблема.

У ходзе першага пасяджэння «На шляху да Вялікай Перамогі: ад зняцця блакады Ленінграда да вызвалення Беларусі» былі заслуханы навуковыя даклады айчынных і замежных даследчыкаў, у тым ліку: Ю. З. Кантар (Санкт-Пецярбург), Н. А. Адамовіч (Мінск), А. М. Літвіна (Мінск),

Ф. А. Свянціцкага (Магілёў), а таксама паведамленні К. Зеліса (Рыга), А. М. Белановіч-Петц (Гамбург), К. Ганцара (Лейпцыг), А. Пятрэнка (Бохум), І. Д. Папова (Волагда) і У. В. Фядзюніна (Масква).

Прадстаўленыя навуковыя матэрыялы і іх абмеркаванне яшчэ раз пераканалі ўдзельнікаў у тым, што 70-годдзе вызвалення адзначаецца не толькі ў Беларусі, але і ў Паўночнай расійскай сталіцы – Санкт-Пецярбургу, дзе зняццё 900-дзённай блакады ў канцы студзеня 1944 г. азначала ні што іншае, як пачатак доўгачаканага вызвалення. Аб гэтым быў даклад вядучага навуковага супрацоўніка, дарадцы дырэктара Дзяржаўнага Эрмітажа, доктара гістарычных навук, прафесара Ю. З. Кантар, якая акрэсліла праблему захавання памяці аб блакадным горадзе і яго жыхарах. Праўда пра блакадную паўсядзённасць, пра сітуацыю ў горадзе ў савецкі час была закрыта цэнзурай, а ў постсавецкі – не выклікала ніякага інтарэсу ў эшалонах улады. На цяперашні час яна захавана ў шматлікіх дакументах, статыстычных даных, дзённіках гараджан, успамінах. Гэта праўда – пры ўсёй яе жорсткасці – супрацьяддзе ад абывацельскага бяспамяцтва і супрацьвага гістарычнай палітыцы, схільнай да палітычнай кан'юнктуры.

Тэму захавання гістарычнай праўды працягнула Н. А. Адамовіч – музейны супрацоўнік, дачка славутага беларускага пісьменніка Алеся Адамовіча. Яна расказала аб тым, як асабісты архіў бацькі стаў асновай для выдання поўнай версіі «Блакаднай кнігі», якая ўбачыла свет да 70-годдзя прарыву блакады – у 2013 годзе. Папярэдняя версія, якая выйшла амаль 30 гадоў таму, была пашкоджана цэнзурай. Новае выданне пабачыла свет без купюр, з дэталёвай прадмовай Д. А. Граніна аб гісторыі стварэння кнігі. Захаваны архіў дазволіў аднавіць шматлікія старонкі і ўпісаць новыя моманты ў эпахальную кнігу памяці пра блакадны горад на Няве.

Вызваленне Беларусі вясной і летам 1944 г. было ў цэнтры ўвагі А. М. Літвіна – загадчыка аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктара гістарычных навук, прафесара. Ён не адзін раз падкрэсліў сваю думку, што, толькі дзякуючы цеснаму ўзаемадзеянню партызан Беларусі з часцямі Чырвонай арміі на ўсіх этапах, аперацыя «Баграціён» мела такое важнае стратэгічнае значэнне ў ходзе Вялікай Айчыннай вайны.

На рэгіянальным узроўні новыя аспекты вызвалення былі раскрыты старшым выкладчыкам кафедры гуманітарных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання Ф. А. Свянціцкім. Раскрываючы баявыя дзеянні штурмавых батальёнаў 65-й арміі пры фарсіраванні Дняпра і захопе Лоеўскага плацдарма ў кастрычніку 1943 г., даследчык адзначыў, што правядзенне Гомельска-Рэчыцкай аперацыі з 10 па 30 лістапада 1943 г. забяспечыла магчымасць для канцэнтрацыі на гэтым плацдарме моцнай групоўкі войскаў у складзе 48, 61 і 65-й армій.

Сярод паведамленняў першага пасяджэння выклікалі асаблівы інтарэс матэрыялы К. Зэліса, А. М. Белановіч-Петц, А. Пятрэнка і маскоўскіх даследчыкаў У. В. Фядзюніна і А. А. Слабадзянюка.

Навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі і сацыялогіі Латвійскага ўніверсітэта, доктар гісторыі К. Зэліс прыцягнуў увагу аўдыторыі цікавым выступленнем на тэму генацыду цыган, якія, разам з яўрэямі, метадычна знішчаліся службамі паліцыі бяспекі і СД на тэрыторыі акупаванай Латвіі і толькі нязначнай іх частцы удалося захаваць жыццё ў такіх умовах.

Дактарант факультэта ўсходнееўрапейскіх даследаванняў Гамбургскага ўніверсітэта А. М. Белановіч-Петц прадставіла ўдзельнікам канферэнцыі вынікі вывучэння тэмы аб прымусовай працы «беларускіх остарбайтараў» у адлюстраванні крыніц вуснай гісторыі. Навуковы экскурс у нямецкамоўную гістарыяграфію прывёў даследчыцу да высновы, што гэта тэма не была аб'ектам навуковага вывучэння амаль 40 пасляваенных гадоў. Цяперашнія тэндэнцыі, наадварот, сведчаць аб перспектывах развіцця міждысцыплінарных даследаванняў на аснове аналізу вуснагістарычных крыніц.

Над пытаннем аб тым, у якой ступені пераклад замежных дакументаў уплывае на ўспрыняцце гістарычных падзей, пастаянна задумваецца дактарант дэпартамента ўсходнееўрапейскіх даследаванняў Лейпцыгскага ўніверсітэта К. Ганцар. Для правядзення аналізу гісторыкам былі ўзяты пераклады данясення аб баявых дзеяннях па захопе Брэст-Літоўска камандзіра 45-й пяхотнай дывізіі генерал-маёра Ф. Шліпера. Аўтар робіць выснову, што няправільны пераклад адмоўна ўплывае на чытацкае бачанне гістарычных падзей.

Аб асноўных праблемах суб'ектыўнай адказнасці жанчын за удзел у розных вайсковых фарміраваннях у гады вайны распавядае выкладчык Рурскага (г. Бохум) універсітэта А. Пятрэнка. Вызначэнне канкрэтнага месца ўдзельнікаў і ўдзельніц украінскага нацыяналістычнага падполля ў іерархіі *ахвяр, герояў* і *злачынцаў* паказвае, што вобраз жанчыны-ўдзельніцы ўкраінскага паўстанцкага руху і па цяперашні час упісаны ў традыцыйны патрыярхальны наратыў (з улікам савецкіх рэалій), які ігнараваў факты шырокага ўдзелу жанчын ва ўкраінскім нацыяналістычным падполлі.

Дацэнты кафедры ўсеагульнай гісторыі Валагодскага дзяржаўнага ўніверсітэта І. Д. Папоў і А. М. Кірылава закранулі пытанні дэнацыфікацыі ў пасляваеннай Баварыі, дзе ўжо ў 1947 г. амерыканская ваенная адміністрацыя праяўляла інтарэс да хутчэйшага яе завяршэння і не стала перашкаджаць масаваму вызваленню і аднясенню асноўнай масы нацыстаў да катэгорыі «памагатых». У выніку да пытання пераадолення нацысцкага мінулага баварская грамадскасць зноў вярнулася толькі ў сярэдзіне 1960-х гадоў.

Старшы выкладчык кафедры айчыннай гісторыі Маскоўскай акадэміі эканомікі і права, кандыдат гістарычных навук У. В. Фядзюнін і ветэран пагранічных войскаў А. А. Слабадзянюк спыніліся на разглядзе пытання аб забеспячэнні тылавой аховы ў арміях Цэнтральнага, Бранскага і Паўднёва-Заходняга франтоў на тэрыторыі Беларусі, РСФСР і Украіны ў жніўні – верасні 1941 г., разглядаючы яго на прыкладзе 21-й арміі Заходняга фронту. Маскоўскія аўтары адзначаюць, што ў цяжкіх умовах няўдалага пачатку Вялікай Айчыннай вайны савецкія пагранічнікі, байцы мясцовых знішчальных батальёнаў і партызанскіх атрадаў забяспечвалі ахову тылу войск, якія вялі баявыя дзеянні на Заходнім фронце.

На другім пленарным пасяджэнні прагучалі даклады А. Г. Зельскага (Мінск), А. І. Корсак (Полацк), У. І. Кузьменкі (Мінск) і С. Я. Новікава (Мінск).

Разглядаючы ў дакументальных крыніцах гісторыю вёскі Хатынь, дырэктар Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу, кандыдат гістарычных навук А. Г. Зельскі звярнуў ўвагу на важнасць далейшага вывучэння гэтай трагедыі з максімальна поўным выкарыстаннем дакументальных крыніц з айчынных архіваў. Таму перад гісторыкамі стаіць актуальная задача аб напісанні спецыяльнай навуковай працы аб трагедыі ў Хатыні вясной 1943 года.

А. І. Корсак, прадстаўляючы вынікі даследавання баявых дзеянняў полацкай падпольнай групы «Адважныя», звяртае ўвагу на важнасць пашырэння базы крыніц, уключаючы сюды пералік успамінаў непасрэдных удзельнікаў. На думку гісторыка, на парадак дня выходзіць задача паглыблення навуковых ведаў аб гэтай групе з улікам новых дакументальных фактаў, без якіх не ўдасца аб’ектыўна паказаць гісторыю падпольнай барацьбы ў Полацку ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Загадчык Цэнтра постіндустрыяльнага грамадства Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук У. І. Кузьменка закрануў пытанне аб сацыяльных працэсах, якія адбываліся ў вызваленай ад нацысцкай акупацыі Беларусі. Разглядаючы становішча розных катэгорый беларускага насельніцтва, гісторык адзначыў той факт, што гэтае пытанне у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі пакуль застаецца адкрытым.

С. Я. Новікаў аднёс праблему навуковай фармалізацыі гістарычных падзей у Беларусі летам 1941 г. да ліку маладаследаваных, разглядаючы іх праз прызму ўспамінаў камандуючага 2-й танкавай групай, генерал-палкоўніка Г. Гудэрыяна. У сваім выступленні дакладчык звярнуў увагу на неабходнасць выяўлення ступені карэляцыі даных, адлюстраваных ва ўспамінах, і іх адэкватнасці тагачасным дакументальным крыніцам. Такі падыход дазволіць пазбегнуць грубых памылак у навуковых даследаваннях, а таксама больш скіруе гісторыкаў на працу з архіўнымі дакументамі.

У паведамленнях, заслуханых на другім пленарным пасяджэнні, звярталася ўвага на новыя дакументальныя знаходкі і гістарыяграфічныя факты з малавядомых старонак гісторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. У ходзе пасяджэння прагучалі паведамленні, якія закраналі наступную тэматыку: «Актуальныя праблемы гістарыяграфіі з жыцця Мінскага антыфашысцкага падполля» (Я. І. Бараноўскі), «Паўсядзённае жыццё савецкага тылу ў гады Вялікай Айчыннай вайны: цяперашні погляд» (В. В. Брыгадзіна), «Праца Д. Фішэра “Савецкая апазіцыя Сталіну” як крыніца па гісторыі калабарацыі на тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.)» (Я. П. Бязлепкін), «Трафеі воінаў Чырвонай арміі і беларускіх партызан у зборы Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны» (І. Ю. Варанкова), «Партызанскі фактар у адносінах сельскага насельніцтва і калабарацыйнай адміністрацыі ў перыяд нацысцкай акупацыі (1941–1944 гг.)» (Я. А. Грэбень), «Лагер смерці ў Драздах летам 1941 г.: праблема захавання памяці)» (І. М. Кузняцоў), «Да пытання аб дзейнасці нямецкай разведвальна-дыверсійнай школы (школ) у Мінску ў гады Вялікай

Айчыннай вайны» (С. В. Кулінок), «Зрыў фінансавых мерапрыемстваў германскіх акупацыйных улад на тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.)» (І. Я. Куракова), «Расследаванне злачынстваў ваеннага часу» (І. А. Лапіна), «Агляд схем класіфікацыі дакументальных крыніц перыяду Вялікай Айчыннай вайны і нямецка-фашысцкай акупацыі (1941–1944 гг.)» (В. М. Матах), «Лёсы савецкіх ваеннапалонных (па матэрыялах фонду 1717 Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці» (А. М. Мох).

У час правядзення трэцяга пленарнага пасяджэння былі заслуханы даклады і паведамленні, у якіх акцэнтавалася ўвага не столькі на старонках ваеннай гісторыі, колькі на канкрэтных людзях і іх незабыўных лёсах, у тым ліку ў аспекце беларуска-нямецкіх узаемадачыненняў. Адкрылася пасяджэнне дакладам «Да пытання аб ацэнцы дзейнасці “імперскага аб’яднання яўрэяў Германіі” (1939–1945 гг.)». Аўтар М. В. Стралец прасачыў гісторыю суполкі на прыкладзе яе змагання за паслабленне палітыкі яўрэйскіх ганенняў у рэйху у час Другой сусветнай вайны.

У дакладзе В. Г. Мазеца аб барацьбе супраць п’янства ў гады Першай сусветнай вайны ішла размова аб розных мерапрыемствах, якія праводзіла мясцовая ўлада ва ўмовах дзейнасці забароны на ўжыванне алкаголю, асабліва ў прыфрантавой паласе на тэрыторыі Беларусі. Паводле дакументаў, апрацаваных гісторыкам, цалкам пазбавіцца ад п’янства не ўдалося нават ва ўмовах вайны.

Аб уплыве Рапальскага дагавора 1922 г. на германска-беларускія сувязі ў 1920-я гады вялася размова ў дакладзе Д. А. Мігуна (Мінск), які паказаў ролю міжнароднага фактара ў наладжванні сувязей у культурнай сферы паміж Расіяй і Германіяй, якія закраналі і Беларусь.

У паведамленнях, заслуханых падчас пленарнага пасяджэння, даследчыкі закранaлі розныя аспекты не толькі ваеннай гісторыі, але і іншыя пытанні найноўшай гісторыі Беларусі, яе палітыкі, эканомікі, культуры і г.д., якія былі адлюстраваны В. Л. Бураковым – «Брэсцкая крэпасць у міжваенны перыяд (1939–1941)», В. М. Галай – «Германізмы як асабовыя намінанты ў ваеннай лексіцы», В. П. Дзмітрыевай – «Нямецкія крыніцы аб насельніцтве беларускіх зямель у гады Першай сусветнай вайны», Д. А. Козелам – «Дзейнасць Беларускага штаба партызанскага руху па арганізацыі авіяперавозак і дастаўцы баявых грузаў партызанскім фарміраванням», С. П. Кубекам – «Дакументы Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь аб дзейнасці Бялыніцкай і Круглянскай ваенна-аператыўных груп (1942–1944)», А. М. Кушнярэвічам – «Нямецкія хронікі XIII–XV стст. як крыніца вывучэння гісторыі Беларусі», Літвіноўскім і Ю. І. Літвіноўскай – «Савецка-германскія дамоўленасці 1939 года)», В. Я. Лагавік – «Вайна ў творчасці беларускіх мастакоў (гуманістычны аспект)», В. М. Астрога – «Сацыяльны статус педагагічнай інтэлігенцыі Германіі ў другой палове XIX–пачатку XX ст.», А. М. Рэзнікам – «Аб крытэрыях аб’ектыўнасці ў асвятленні дыскусійных пытанняў гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (з нагоды выхаду навукова-публіцыстычных кніг Р. К. Паўловіча)», І. А. Саракавікам – «Развіццё дружбы і супрацоўніцтва моладзі Беларусі і Германіі (другая палова XX ст.)», М. М. Смальянінавым – «Удзел беларусаў у Першай

сусветнай вайне: пачатковы перыяд (жнівень – снежань 1914 г.)», Я. М. Цішчанка і С. А. Сіткевічам «Упраўленне медыцынай ва ўмовах германскай акупацыі і партызанскай вайны на тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.)»… Паднятых на канферэнцыі вострых пытанняў не пералічыць! Усе выступленні надрукаваны, пабачылі свет, і тыя, хто зацікавіцца, могуць азнаёміцца з імі.

Заключнай часткай працы канферэнцыі стала прэзентацыя новых выданняў, падрыхтаваных кафедрай гісторыі, сусветнай культуры і турызму за 2013 год. С. Я. Новікаў прадставіў 12-ы выпуск матэрыялаў канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць». А. Г. Цымбал пазнаёміў удзельнікаў з вынікамі вывучэння С. Я. Новікавым тэмы «Беларусь улетку 1941 года: новыя падыходы ў даследаванні баявых дзеянняў». Э. Р. Іофе прапанаваў навуковую ацэнку гэтай працы, прадстаўленую ў форме крытычнага аналізу новых падыходаў у даследаванні баявых дзеянняў на Беларусі летам 1941 года. А. М. Рэзнік засяродзіў увагу на дыскусійных пытаннях пачатковага перыяду Вялікай Айчыннай вайны ў кнізе С. Я. Новікава.

У заключэнне былі падведзены вынікі канферэнцыі, удзельнікі якой адзначылі, што навуковае абмеркаванне гістарычнага феномена Вялікай Айчыннай вайны і звязанай з ёй даследчыцкай праблематыкай у фармаце штогадовай канферэнцыі з’яўляецца адметнай формай вядзення сучаснага навуковага дыскурсу з удзелам даследчыкаў нашай краіны, краін СНД і далёкага замежжа. Актыўнае супрацоўніцтва навукоўцаў у фармаце такіх сустрэч – трывалы падмурак для правядзення наступных сустрэч у Цэнтры беларускай мовы і культуры МДЛУ. Добрай прыкметай закладзенай шматгадовай традыцыі з’яўляецца таксама рэгулярнае выданне матэрыялаў міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць».

*Поступила в редакцию 26.03.15*